**А. М. Кушнярэвіч**

# БІДЭРМАЕР І ЯГО РАСПАЎСЮДЖВАННЕ У БЕЛАРУСКІМ МАСТАЦТВЕ

Як мастацтвазнаўчы тэрмін “бідэрмаер” упершыню з’явіўся 1894 г. у адным з нямецкіх артыкулаў, які быў прысвечаны пытанням развіцця дэкаратыўна-ужытковага мастацтва. У пачатку XX ст. у Германіі ў зборніках “Мастацтва і рамяство” быў надрукаваны цэлы шэраг артыкулаў, прысвечаных стылю бідэрмаер. У той час гэта паняцце пачало фігураваць у каталогах і артыкулах Венскага мастацкага музея адносна вышэй згаданага мастацтва. З 1913 г. у Германіі пачалі выходзіць кнігі і артыкулы, у якіх бідэрмаеер характарызаваўся ў двух аспектах: як стыль мэблі і як светаадчуванне эпохі. У 1922 г. нямецкі мастацтвазнавец П. Ф. Шмідт упершыню яго ўжыў у дачыненні да жывапісу. Стварэнне свяшчэннай асабістай прасторы, свет хатняга жыцця, адмаўленне ад героікі і спакойны аптымізм – так у цэлым вызначаюць светасузіранне бідэрмаеера замежныя і айчынныя даследчыкі. Яго храналагічныя рамкі, як і любой мастацкай з’явы, не абмяжоўваюцца дакладнымі гісторыка-палітычнымі межамі. У адпаведнасці з агульнапрынятай перыядызацыяй гавораць аб ранім (1810–1830-е гг.) і познім (1830–1850-е гг.) бідэрмаееры. Этымалагічны і гістарычны аналіз гэтага паняцця і сама з’ява “бідэрмаер” сведчаць, што яго аўтары ў пачатку XIX ст. адкрылі для сябе асобы тып мастацтва, звязаны менавіта з эстэтычнымі ідэламі бюргерства, а не буржуазіі. Жывапіс бідэрмаеера пабудаваны на класіцыстычнай аснове, якая канкрэтызавана жывой, даставернай перадачай дэталяў і асобных прадметаў.

Бідэрмаеер – вымышлены персанаж, які прыдумалі баварскія паэты Л. Айхродт і А. Кусмаўль на мяжы 1840–1850-х гг. у якасці насмешкі над кансерватыўным нямецкім бюргерствам, якому, як лічылі паэты, не месца ў сучаснай актыўнай рэчаіснасці (з сярэдзіны XIX ст. грамадская свядомасць Германіі была настроена на рашучыя змены). Неабходна адзначыць, што сам па сабе вобраз сціплага, далёкага ад палітыкі бюргера Готліба Бідермаера, як і яго вобраз – рэальны школьны настаўнік Самуэль Заўтер – не утрымліваў адмоўных рыс, аднак успрымаўся ў насмешлівым сэнсе у кантэксце рэвалюцыйна-пераўтваральных настрояў. У далейшым у семантыцы слова “бюргер” устойліва замацавалася гэта двухсэнсоўнасць: найменне сацыяльнага слоя і разам з тым сінонім «абывацеля», «крывадушніка» (Сідарава Т. В.).

Бідэрмаеер як накірунак жывапісу з’яўляецца працягам бытавога жанру, які атрымаў распаўсюджванне ў мастацтве папярэдняга часу. У гэтым жывапісу быт падаецца як хатняя атмасфера з яе спакойным, мірным жыццём, у якое замест героікі прыйшла радасць паўсядзённасці. Яго творы

ствараліся на класічнай аснове (выразны малюнак, ураўнаважаная кампазіцыя, дакладная мадэліроўка формаў). Бідэрмаер з'яўляецца адгалінаваннем рамантызму, які прыйшоў на змену ампіру. Для бідэрмаера характэрна дакладная выява інтэр'ера, прыроды і бытавых дэталяў. Перш за ўсе гэты стыль выразіўся ў жывапісу. Яго самыя вядомыя прадстаўнікі: нямецкія мастакі Г. Ф. Керстынг, Л. Рыхтэр, К. Шпіцвег, аўстрыйскія М. Швінд, Ф. Вальдмюллер (Чэснакова Л. В.).

У якасці прычын узнікнення бідэрмаера і яго далейшага распаўсюджвання ў Еўропе даследчыкі называюць стомленасць ад сацыяльных і палітычных катаклізмаў эпохі напалеонаўскіх войнаў, якія выклікалі ў бюргерскім грамадстве жаданне ўцячы ад грамадскіх праблем і глабальных катаклізмаў, абмежавацца камфортным існаваннем у сваім утульным хатнім кутку. На змену рэвалюцыйным настроям прышла патрэба ў спакойным жыцці. Акрамя таго, у гэту эпоху ў Германіі надыйшоў перыяд рэстаўрацыі, калі былі ліквідаваны пераўтварэнні напалеонаўскай Францыі, узмацнілася сістэма сыску і самавольства ўладаў. Была ўзмоцнена цэнзура супраць палітычнай апазіцыі. Самай вядомай ахвярай сярод вольналюбівых паэтаў таго часу стаў Генрых Гейне, які быў вымушаны ў 1831 г. эміграваць у Парыж. Буржуазная грамадскасць Германіі, у адрозненне ад буржуазіі суседніх краін, такіх як Англія і Францыя, не мела палітычнага ўплыву і была вымушана задавальняцца сямейнай сферай і культаваннем прыватнага жыцця. Адпаведна паўсюдна распаўсюджаным у'яўленням, бідэрмаер лічыцца ўвасабленнем прыватнага жыцця і хатняй утульнасці. Цудоўныя дзіцячыя тварыкі, бюргеры, перапоўненыя пачуццём уласнага гонару, прыгожыя дамы ў цёплым сямейным коле, утульныя інтэр'еры і жывапісныя гарадскія вуліцы – падобныя вобразы ствараюць уражанне аб гэтай эпосе (Хадакоўскі Я.).

Найбольшае распаўсюджванне бідэрмаер атрымаў ў Еўропе ў перыяд 1815–1848 гг. галоўным чынам у Германіі і Аўстрыі. а таксама ў Даніі і Нідэрландах. Яго праявы маюцца таксама ў культуры іншых еўрапейскіх краін. У Расіі гэты стыль закрануў найперш еўрапеізіраваную частку насельніцтва. Бідэрмаерская эстэтыка сустракаецца ў мастакоў В. Трапініна, А. Веніцыянава, П. Фядотава, выступаючы як антытэза халоднай і афіцыйнай пецярбургскай рэчаіснасці (Часнакова Л. В.).

Бідэрмаер – гэта не проста стыль, а адлюстраванне грамадскай атмасферы эпохі, вобраза жыцця, густаў і светапогляду прадстаўнікоў бюргерства. Гэта комплексная з'ява, якая ахапіла літаратуру, філасофію, мастацтва, абыдзеную свядомасць свайго часу. Галоўнымі ж каштоўнаснымі характарыстыкамі стыля бідэрмаер з'яўляюцца апалітычнасць, прыватнасць, бесканфліктнасць. Вызначальны ўплыў на яго развіцце аказаў буржуазны светапогляд. Нямецкае мастацтва першай паловы XIX ст. характарызавалася тым, што бюргерства пачало канкурыраваць з дваранствам як заказчык твораў мастацтва. Стыль бідэрмаер адпавядаў вобразу жыцця, магчымасцям, а таксама матэрыяльным і духоўным запатрабаванням прадстаўнікоў буржуазных слаёў грамадства. Уласцівыя гэтаму стылю карціны невялікага і сярэдняга фармата ўказваюць на

асноўнага заказчыка – бюргера невялікага і сярэдняга дастатку, які імі ўпрыгожваў жылую прастору. Таму невыпадкова бідэрмаер характарызуюць яшчэ і як бюргерскую эпоху ў культуры, калі на першы план сталі выходзіць каштоўнасці паўсядзённага, буржуазнага, гарадскога жыцця. Прыйшоўшы на змену пафаснаму і нежыломуампіру, бідэрмаер пачаў ухваляць утульнасць, простыя чалавечыя каштоўнасці, зручнасць і сямейнае шчасце. На карцінах таго часу перад гледачом ва ўсіх дэталях прадстаюць хатні быт і ціхія сямейныя радасці благапрыстойнага бюргера, таму ў выбары сюжэтаў вылікую ролю адагрывае партрэт, сям’я, жылое памяшканне. Вельмі папулярнымі былі творы з выявамі інтэр’еру альбо людзей у інтэр’ерах за хатняй працай. Тыповая карціна бідэрмаера – дзяўчына ў сціплым пакоі, схіліўшаяся над вышываннем ці кнігай. Сюжэтам уласцівы хатнеінтымны сцэнарый: кветкі ў гаршках, шыццё ў руках жанчын, простая, але зручная і вытанчаная мэбля.

У другой трэці XIX ст. падчас станаўлення буржуазна-мяшчанскага вобраза жыцця і развіцця стылю бідэрмаер выпрацоўвалася новая стылёва-жанравая іерархія мастацтва, запатрабаванага не столькі храмам і палацам, колькі сціплай сядзібай і гарадской кватэрай. На змену манументальна-дэкаратыўным формам мастацтва прыйшлі малафарматныя пейзаж, нацюрморт ды інтэр’ер, а таксама вялікая разнастайнасць бытавых матываў, якія аказаліся найбольш прыдатнымі для ўвасаблення свайго часу. Сюжэтна-тэматычная карціна і партрэт, хоць і звязаны з папярэдняй традыцыяй, але таксама набываюць больш камерны характар. Паўсядзённасць з яе звыкласцю і паўтаральнасцю аказалася больш прыцягальнай, чым вялікія ідэі Асветніцтва і рамантызма, якія сябе не апраўдалі.

У германскія ўплывы ў беларускім жывапісу першай паловы XIX ст. найперш праявіліся ў распаўюджванні бідэрмаера, эстэтыка якога не несла ў сябе змястоўных глабальных задач. Яна звернута да пейзажу, інтэр’еру, да матываў, якія падкрэсліваюць сціпласць, утульнасць чалавечага існавання ў рамках вялікага ці маленькага горада, мястэчка, але заўжды гэта быў рэальны чалавек у рэальнай прасторы. У дадзеным кантэксце гаворка не ідзе аб усеабдымным уплыве бідэрмаера на беларускае пейзажнае мастацтва. Даследчыкі гэтага накірунку прасачылі ў ім складаную жанравую структуру: партрэт, бытавая карціна, пейзаж (А. І. Чупрынскі).

На Беларусі станаўленне бідэрмаера прыпадала на перыяд рэакцыйнай палітыкі царызма і ў пэўным сэнсе было натуральным імкненнем грамадства кансерваваць свой лад жыцця праз уцёкі ў свет сям’і і паэтызацыю штодзённасці. Гэта тэндэнцыя не пярэчыла папярэднім – культу шляхецкага роду (сарматызм) і культу натуральных сямейных адносін (сентыменталізм). Беларуская інтэлегенцыя таго часу пераважна паходзіла з дробнай шляхты альбо мяшчанства, і густы гэтага асяродка яшчэ захоўвалі памяць аб шляхетным вобразе жыцця. Накіраванасць бідэрмаера на захаванне сямейных традыцый найлепшым чынам служыла патрэбам беларускай культуры, бо ахоўвала яе прастору ад імперскага ціску і русіфікацыі. Пры гэтым бідэрмаер

імкнуўся прымірыць супярэчнасці паміж класіцызмам і рамантызмам, з аднаго боку, і рамантызмам і рэалізмам – з другога. Апроч таго, у кожнай краіне на дадзеную аснову накладваліся ўласцівыя для кожнай нацыянальнай школы адметнасці. У англійскім мастацтве заўсёды быў адчувальны ўплыў сентыменталізму, у нямецкім – рамантызму, у беларускім – барока (Вакар Л. У.). Беларускія мастакі бідэрмаера імкнуліся да адлюстравання не сталічнага ўрбаністычнага асяроддзя, а краявідаў сельскай мясцовасці. Многія з іх не мелі стацыянарных майстэрняў, таму ў іх выпрацавалася звычка працаваць на пленэры. Істотнай прычынай з'яўлення прац у стыле "бідэрмаер" была адсутнасць афіцыйных заказаў, што прымусіла беларускіх мастакоў шукаць новыя формы выказвання выяўленчага матэрыялу. Узнікла ўвага да гарадскога пейзажа, архітэктурных помнікаў і розных пазнаваемых выглядаў.

У працах І. Шчадроўскага "Дарога ў лесе" (1836 г.), "Паляўнічыя" (1839 г.), "Пейзаж з паляўнічымі"(1839 г.) назіраюцца элементы дзеяння і расказа. Літаграфія К. Русецкага "Пейзаж з скачкамі" (каля 1850-х гг.) характарызуе своеасаблівасць беларускага бідэрмаера: цікавасць да нацыянальнай тэмы і яе самабытнаму адлюстраванню. Гэта таксама ўласціва пейзажам І. Хруцкага "Сніпішкі. Прадмесце Вільні", "Да святога месца" (1840-е гг.), "Выгляд у маёнтку Жыровічы" (1847 г.). У працах І. Хруцкага праявіліся рысы бідэрмаера, стылявыя асаблівасці якога заключаюцца ў наступным: у спалучэнні мастацка-эстэтычных функцый з утылітарнай функцыяй канкрэтызацыі прыроднага асяроддзя як спосаба мастацкага адлюстравання свету (Вакар Л. У., Чупрынскі А. І.).

Такім чынам, бідэрмайер – мастацкі накірунак, які дазволіў сістэматызаваць пад эгідай агульных тэматычных, тыпалагічных і формаутваральных прыкмет раней разрозненыя з'явы не толькі еўрапейскага, але і беларускага мастацтва, у якім ён праявіўся ў пейзажным жывапісу. Папулярнасць гэтага стылю з яго цеплынёй, цікавасцю да канкрэтнага чалавека, паказанага ў хатнім асяроддзі, будзе ўзрастаць у век глабалізацыі, камп'ютэрызацыі, панавання тэхналогій і віртуальных каштоўнасцей.